УДК 342.728

# ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАРТЫІ І ГРАМАДСКІЯ АБ’ЯДНАННІ, ЯКІЯ ДАМАГАЮЦЦА ПАЛІТЫЧНЫХ МЭТ: СУАДНОСІНЫ ПАНЯЦЦЯЎ І РАЗВІЦЦЁ КАНСТЫТУЦЫЙНА-ПРАВАВОГА РЭГУЛЯВАННЯ

***А.Л. Дашкевіч,***
*загадчык кафедры канстытуцыйнага і адміністрацыйнага права Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

Развіццё палітычнай сістэмы Беларусі патрабуе комплекснага асэнсавання канстытуцыйна - прававога рэгулявання дзейнасці яе розных суб’ектаў. Асабліва гэта тычыцца структур грамадзянскай супольнасці, якія ў дадзеным выпадку прадстаўлены палітычнымі партыямі і іншымі грамадскімі аб’яднаннямі. Пошук заканадаўцам аптымальнай мадэлі рэгулюючага ўздзеяння, на працягу існавання сучаснай беларускай дзяржавы, канцэнтраваўся, напачатку, на забеспячэнні перахода ад савецкай палітычнай сістэмы, у аснове якой знаходзілася камуністычныя партыя, да палітычнай сістэмы, дзе палітычныя партыі і іншыя грамадскія аб’яднанні не з’яўляюцца непасрэдным элементам дзяржаўнаўладнага механізму. Стварэнне і развіццё палітычных партый і іншых грамадскіх аб’яднанняў ажыццяўлялася ў межах, перш за ўсё канстытуцыйнага заканадаўства, якое адлюстроўвала вышэй азначаны працэс. Пры гэтым існаванне шматлікай сеткі разнастайных грамадскіх аб’яднанняў, якая за апошнія гады набыла ў цэлым ўстойлівы характар, пошук эфектыўных механізмаў палітычнай канкурэнцыі, заснаваных на канстытуцыйных нормах, патрабуе папярэдняга ўдасканалення канстытуцыйна-прававога рэгулявання ў дачыненні дыфірэнцыяцыі ўдзелу ў палітычных працэсах адпаведных грамадскіх аб’яднанняў.

Праблематыка канстытуцыйна-прававога рэгулявання дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў выклікае цікавасць з боку навукоўцаў і практыкаў [гл. напр.: 1, 2, 3]. Значная праца па абагульненні прававога рэгулявання і ўдасканаленні правапрымяняльнай практыкі адносна грамадскіх аб’яднанняў праводзіцца Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь [гл. напр.: 4]. Аднак пытанні, звязаныя з вылучэннем і суадносінамі ў канстытуцыйным заканадаўстве такіх паняццяў як “грамадскае аб’яднанне, якое дамагаецца палітычных мэт” і “палітычная партыя” практычна не вывучалася.

Трэба адзначыць, што ў канстытуцыйным заканадаўстве Беларусі савецкага часу асобна ад іншых грамадскіх арганізацый вылучалася адзіная існаваўшая на той час палітычная партыя. Так, паводле арт. 6 Канстытуцыі БССР 1978 г. кіруючай і накіроўваючай сілай савецкага грамадства, ядром яго палітычнай сістэмы, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый з’яўлялася Камуністычная партыя Савецкага Саюза [5]. Пры гэтым у наступным артыкуле адзначалася, што прафесіянальныя саюзы, Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі, кааператыўныя і іншыя грамадскія арганізацыі ў адпаведнасці

са сваімі статутнымі задачамі ўдзельнічаюць у кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі, у вырашэнні палітычных, гаспадарчых і сацыяльна-культурных пытанняў. Тым самым падкрэслівалася, што разам з камуністычнай партыяй, якая займае асаблівае становішча, у кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі, у вырашэнні палітычных пытанняў прымаюць удзел і іншыя грамадскія арганізацыі. Знітаванасць у дзяржаўным механізме органаў улады і кіравання з партыйнымі органамі і органамі грамадскіх арганізацый праяўляла сябе ў тым ліку ў прыняцці сумесных нарматыўных прававых актаў. Такі падыход да ўзаемадзеяння прыводзіў да “аддзяржаўлення” грамадскага сектару, які практычна быў неадрыўны ад партыйна-дзяржаўнай сістэмы ўлады [6, с. 362-365].

Законам ад 28 ліпеня 1990 г. уносяцца змены і дапаўненні ў Канстытуцыю БССР 1978 г. (арт. 6, 7, 49), якія замацоўвалі шматпартыйнасць і прадугледжвалі роўныя ўмовы для дзейнасці розных грамадскіх аб’яднанняў, магчымасць іх удзелу ў выпрацоўцы палітычнага курсу БССР, яе сацыяльна-эканамічным, духоўным развіцці, у кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі [7]. У прыватнасці ў арт. 49 устанаўлівалася, што грамадзяне БССР маюць права аб'ядноўвацца ў палітычныя партыі, грамадскія арганізацыі, удзельнічаць у масавых рухах. Забаранялася ўтварэнне і дзейнасць партый, грамадскіх арганізацый, масавых рухаў, мэтай якіх з’яўлялася гвалтоўнае змяненне савецкага канстытуцыйнага ладу, а таксама тых, што выступаюць супраць цэласнасці і бяспекі рэспублікі, канстытуцыйных правоў і свабод яе грамадзян (арт. 7). Разам з унясеннем паправак у Канстытуцыю БССР Вярхоўны Савет прымае Пастанову “Аб рэгістрацыі грамадскіх аб'яднанняў у Беларускай ССР”[8]. Пунктам 1 гэтага дакумента на Савет Міністраў ускладаўся абавязак па распрацоўцы і прыняццю Часовага палажэння “Аб парадку ўтварэння і дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў грамадзян у Беларускай ССР”, якое б рэгулявала грамадскія адносіны ў азначанай сферы да прыняцця Законаў БССР і СССР “Аб грамадскіх аб'яднаннях”. Урад Беларусі 3 кастрычніка 1990 г. зацвярджае “Часовае палажэнне аб парадку ўтварэння і дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў грамадзян Беларускай ССР” [9], дзе не прыводзілася акрэсленага вызначэння паняццяў як “палітычная партыя”, так і “грамадскае аб’яднанне”. Сярод грамадскіх аб’яднанняў асобна вылучаліся палітычныя партыі і масавыя рухі, што адпавядала дзеючым на той час канстытуцыйным нормам. Асаблівасцю масавых рухаў была адсутнасць фіксаванага членства. Замацоўваўся явачна-рэгістрацыйны парадак стварэння грамадскіх аб’яднанняў.

9 кастрычніка 1990 г. прымаецца саюзны Закон “Аб грамадскіх аб’яднаннях” [10], дзе раскрываўся змест паняцця “грамадскае аб’яднанне”. Вызначалася, што грамадскае аб’яднанне ўяўляе сабой дабравольнае фарміраванне, якое ўзнікла ў выніку свабоднага волевыяўлення грамадзян, аб’яднаўшыхся на падставе агульнасці інтарэсаў. У якасці асобных відаў грамадскіх аб’яднанняў вылучаліся палітычныя партыі, масавыя рухі, прафесійныя саюзы, жаночыя, маладзёжныя і дзіцячыя, ветэранскія арганізацыі, арганізацыі інвалідаў, навуковыя, тэхнічныя, культурна – асветніцкія, фізкультурна-спартыўныя і іншыя дабра-

вольныя аб'яднанні, творчыя саюзы, зямляцтвы, фонды, асацыяцыі і іншыя аб'яднанні грамадзян.

27 лютага 1991 г. Законам БССР "Аб асноўных прынцыпах народаўладдзя ў Беларускай ССР" (арт. 9, 11, 12) замацоўваецца забарона дзяржаўнага фінансавання палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў, якія мелі палітычныя мэты, недапускалася ўмяшанне грамадскіх аб'яднанняў у дзейнасць дзяржаўных устаноў і службовых асоб, роўна як і ўмяшанне апошніх у дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў, акрамя выпадкаў прама вызначаных законам. Было ўстаноўлена, што палітычныя партыі і іншыя грамадскія аб'яднанні, якія маюць палітычныя мэты, могуць ажыццяўляць сваю дзейнасць на дзяржаўных прадпрыемствах, установах, арганізацыях толькі за кошт сродкаў гэтых аб'яднанняў, у непрацоўны час іх членаў ці ўдзельнікаў. Адзначалася, што ўдзел ці ня ўдзел грамадзяніна ў дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў не можа быць падставай для абмежавання яго правоў і свабод, у тым ліку ўмовай заняцця пасады ў дзяржаўным органе, або падставай для невыканання абавязкаў прадугледжаных законам [11]. Тым самым у канстытуцыйным заканадаўстве замацоўваецца вылучэнне, разам з палітычнымі партыямі, грамадскіх аб'яднанняў, якія не з'яўляюцца палітычнымі партыямі, але пры гэтым ставяць перад сабой палітычныя мэты.

Вылучэнне сярод грамадскіх аб'яднанняў, асобна палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, якія дамагаюцца палітычных мэт выразна замацоўваецца пазней у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. У арт. 36 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацоўваецца, што кожны мае права на свабоду аб'яднанняў [12]. Пры гэтым устаноўлена забарона быць членамі палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў, якія дамагаюцца палітычных мэт, суддзям, пракурорскім работнікам, супрацоўнікам органаў унутраных спраў, Камітэта дзяржаўнага кантролю, органаў бяспекі, ваеннаслужачым. Дадаткова прадугледжана (у частцы другой арт. 86 Канстытуцыі) неабходнасць прыпынення Прэзідэнтам свайго членства ў палітычных партыях і іншых грамадскіх аб'яднаннях, якія дамагаюцца палітычных мэт, на ўвесь тэрмін. Указаныя абмежаванні ў цэлым стасуюцcца з нормамі Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах (арт. 22) [13], дзе прадугледжваецца, што кожны чалавек мае права на свабоду асацыяцыі з іншымі, у тым ліку і адносна права ствараць прафсаюзы, уступаць у іх для абароны сваіх інтарэсаў, пры чым абмежаванні свабоды асацыяцый магчымы на падставе закону і толькі такія, якія неабходны ў дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах дзяржаўнай і грамадскай бяспекі, грамадскага парадку, аховы здароўя і маральнасці насельніцтва ці абароны правоў і свабод іншых асобаў. Пакт таксама ўстанаўлівае, што дзяржава мае права ўводзіць законныя абмежаванні карыстання азначанай свабодай для асобаў, якія ўваходзяць у склад узброеных сіл і паліцыі. У Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод (арт. 11) [14], яшчэ дадаткова адзначаецца, што законныя абмежаванні свабоды асацыяцый таксама магчымы і ў адносінах да асобаў, якія ўваходзяць у склад адміністратыўных органаў дзяржавы.

Вылучаюцца грамадскія аб’яднанні, якія дамагаюцца палітычных мэт і ў іншых нарматыўных прававых актах. У прыклад можна прывесці частку другую артыкула 9 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства” ад 4 студзеня 2010 г., дзе адзначаецца, што замежнікі не могуць быць членамі палітычных партый і іншых грамадскіх аб’яднанняў, што створаны і дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, якія дамагаюцца палітычных мэт [15]. У п. 3 арт. 2 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі ад 13 студзеня 2011 г. устаноўлена, што ва ўстановах адукацыі не дапускаецца стварэнне і дзейнасць палітычных партый, іншых грамадскіх аб’яднанняў, якія дамагаюцца палітычных мэт [16].

Паводле арт. 1 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб палітычных партыях” ад 5 кастрычніка 1994 г. палітычнай партыяй з’яўляецца дабравольнае грамадскае аб’яднанне, што дамагаецца палітычных мэт, садзейнічае выяўленню і выражэнню палітычнай волі грамадзян, якое ўдзельнічае ў выбарах [17]. Адначасова Закон Рэспублікі Беларусь “Аб грамадскіх аб’яднаннях” ад 4 кастрычніка 1994 г. (далей – закон) не распаўсюджвае сваё дзеянне на палітычныя партыі і не прадугледжвае вылучэнне грамадскіх аб’яднанняў, якія дамагаюцца палітычных мэт. Замацоўваюцца віды грамадскіх аб’яднанняў, якія маюць асаблівасці прававога рэгулявання стварэння і дзейнасці, а менавіта міжнародныя, рэспубліканскія, мясцовыя, маладзёжныя і дзіцячыя. Паводле арт. 1 закону грамадскім аб’яднаннем з’яўляецца дабравольнае аб’яднанне грамадзян, ва ўстаноўленым парадку аб’яднаўшыхся на падставе агульнасці інтарэсаў для задавальнення нематэрыяльных патрэб і дасягнення статутных мэт [18]. У межах аналізу зместу прыведзеных вышэй канстытуцыйных норм, паняццяў палітычнай партыі і грамадскага аб’яднання, можна канстатаваць магчымасць стварэння грамадскіх аб’яднанняў, якія дамагаюцца палітычных мэт не толькі ў выглядзе палітычных партый, але і іншых грамадскіх аб’яднанняў. Пры гэтым у канстытуцыйным заканадаўстве не канкрэтызуецца, якія патрабаванні і падставы неабходна выкарыстоўваць для іх вылучэння сярод грамадскіх аб’яднанняў. Зыходзячы з гэтага адсутнічае і асобны ўлік грамадскіх аб’яднанняў (акрамя палітычных партый), якія дамагаюцца палітычных мэт.

Падсумоўваючы адзначым, што канстытуцыйныя нормы і нормы, замацаваныя ў іншых нарматыўных прававых актах адносна палітычных партый і грамадскіх аб’яднанняў, якія дамагаюцца палітычных мэт, прадугледжваюць ўжыванне апошняга паняцця ў шырокім і вузкім разуменні. Да грамадскіх аб’яднанняў, якія дамагаюцца палітычных мэт, у шырокай трактоўцы паняцця грамадскага аб’яднання, трэба адносіць і палітычныя партыі. Адначасова прысутнічае асобнае канстытуцыйна-прававое рэгуляванне дзейнасці ўласна грамадскіх аб’яднанняў, якое распаўсюджваецца і на грамадскія аб’яднанні, што дамагаюцца палітычных мэт, за выключэннем палітычных партый. Пры гэтым адзначаныя аб’яднанні ў законе асобна не вылучаюцца. Прысутнічае прававая нявызначанасць, што патэнцыйна можа прыводзіць да ўстанаўлення неабгрунтаваных абмежаванняў пры рэалізацыі канстытуцыйнага права на свабоду аб’яднанняў пэўнымі катэгорымі грамадзян. Тым больш, што гэта датычыцца праваадносін, якія характарызуюцца наяўнасцю ўладных паўнамоцтваў у адпаведных суб’ектаў.

Можна выказаць меркаванне, што ў дадзеным выпадку прававыя нормы, якія рэгулююць адпаведныя грамадскія адносіны патрабуюць удакладнення.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

1. Правовое положение общественных объединений в Республике Беларусь: Сб. авт. ст. / Под общ. ред. Е.Н.Липской. - Мн. : Изд. дом "Белый ветер", 2001. - 371 с.

2. Политические партии: Беларусь и современный мир / М.Ф. Чудаков, А.Е. Вашкевич, С.А. Альфер и др. - Мн.: Тесей, 2002. – 368 с.

3. Янковская, Е.В. Конституционно-правовой статус общественных объединений в Республике Беларусь: автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата юридических наук: специальность 12.00.02 Конституционное право; муниципальное право / Е.В. Янковская. - Минск, 2011. - 24 с.

4. Слижевский, О. Л. Реализация права на свободу объединений в Республике Беларусь / О. Л. Слижевский // Законность и правопорядок — 2010. — № 4. — С. 50—54.

5. Канстытуцыя (Асноўны Закон) Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі: прынята на нечарговай дзевятай сесіі Вярхоўнага Савета БССР дзевятага склікання 14 красавіка 1978 года. — Мінск: Беларусь, 1978. — 61 с.

6. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. Беларусь у 1946 – 2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]; рэд. калегія: М. Касцюк (гал. рэд.). – Мінск: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – 728 с.

7. Аб змяненнях і дапаўненнях Канстытуцыі (Асноўнага Закону) Беларускай ССР: Закон Беларускай ССР, 28 ліпеня 1990 г., №212 – XII // Збор Законаў БССР. – 1990. - №22. - Арт. 450.

8. Аб рэгістрацыі грамадскіх аб’яднанняў у Беларускай ССР: Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 28 ліпеня 1990 г., №222 - XII // Збор Законаў БССР. - 1990. - №22. - Арт. 460.

9. Аб зацвярджэнні “Часовага палажэння аб парадку ўтварэння і дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў грамадзян у Беларускай ССР”: Пастанова Савета Міністраў БССР, 3 кастр. 1990 г., №255 // Збор Законаў БССР. - 1990. - №29. - Арт. 565.

10. Об общественных объединениях: Закон СССР, 9 октября 1990 г., №1708-1 // Ведомости СНД и ВС СССР. – 1990. – №42. – Ст. 839.

11. Аб асноўных прынцыпах народаўладдзя ў БССР: Закон БССР, 27 лютага 1991 г., №651-XII // Ведамасці Вярхоўнага Савета БССР. - 1991. - №1. - Арт. 129.

12. Конституция Республики Беларусь 1994 года (с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г.). – Минск: Амалфея, 2007. – 48 с.

13. Международный пакт о гражданских и политических правах // Права человека: Сб. международно-правовых док. / Сост. Щербов В. В. - Мн.: Белфранс, 1999. – С. 13-27.

14. Европейская конвенция о защите прав человека и основных свабод // Права человека: Сб. международно-правовых док. / Сост. Щербов В. В. - Мн.: Белфранс, 1999. – С. 761-772.

15. О правовом положении иностранных граждан и лиц без гражданства в Республике Беларусь: Закон Респ. Беларусь от 4 янв. 2010 г. № 105-З // ИБ "КонсультантПлюс: Беларусь" [Электронный ресурс]. - Минск, 2016.

16. Кодекс об образовании: Кодекс Респ. Беларусь, 13 янв.2011 г. № 243-З // ИБ "КонсультантПлюс: Беларусь" [Электронный ресурс]. - Минск, 2016.

17. О политических партиях: Закон Респ. Беларусь, 5 октября 1994 г., №3266-XII // ИБ "КонсультантПлюс: Беларусь" [Электронный ресурс]. - Минск, 2016.

18. Об общественных объединениях: Закон Респ. Беларусь, 4 октября 1994 г., №3254-XII // ИБ "КонсультантПлюс: Беларусь" [Электронный ресурс]. - Минск, 2016.

УДК 342.721

# КОНСТИТУЦИОННО-ПРАВОВЫЕ ОСНОВЫ ЗАЩИТЫ НЕПРИКОСНОВЕННОСТИ ЧАСТНОЙ ЖИЗНИ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ И ЗАРУБЕЖНЫХ СТРАНАХ

***Е.Ф. Ивашкевич,***
*доцент кафедры истории и теории права юридического факультета, «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова»*
***А.Н. Иванчиков,***
*выпускник юридического факультета, «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова»*

В последнее время право на неприкосновенность частной жизни является важнейшим неотъемлемым объектом конституционного регулирования. Объясняется это прежде всего демократизацией общества и государства, гуманизацией и универсализацией права, имплементацией международных стандартов в национальное законодательство, конституционным закреплением приоритетной роли человека, его прав и свобод как высшей ценности государства. Особенно актуальной в настоящее время является проблема защиты личных данных от их свободного распространения в средствах массовой информации, в том числе в виртуальной среде, так как помимо официальных источников информации, интернет-сайтов, где располагается достоверная информация, имеется множество социальных сетей, поисковых систем и блогов, «благодаря» которым различная информация частного характера стала абсолютно открытой и доступной для любого пользователя Глобальной сети. В связи с этим ущерб, причиненный посредством неправомерного пользования частными данными лица, может быть крайне велик и быть как моральным, так и имущественного характера.

Согласно конституционному положению ст. 28 Конституции Республике Беларусь «каждый имеет право на защиту от незаконного вмешательства в его личную жизнь, в том числе от посягательств на тайну его корреспонденции, телефонных и иных сообщений, на его честь и достоинство» [1], а правовой нормой ст.4 Закона Республики Беларусь «Об информации, информатизации и защите информации» одним из важнейших принципов правового регулирования информационных отношений в Республике Беларусь декларируется защита информации о частной жизни физического лица и персональных данных [2].